НАВІНЫ

Выданьне Арганізацыйнага камітэту.

2 1988

БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА ФРОНТУ ЗА ПЕРАБУДОВУ «АДРАДЖЭНЬНЕ»

АРГАНІЗАЦЫЙНЫ КАМІТЭТ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА ФРОНТУ ЗА ПЕРАБУДОВУ "АДРАДЖЭНЬНЕ" ПАДРЫХТАВАЎ МАТЭРЫЯЛЫ ДА ПРАЕКТУ ПРАГРАМЫ І ПРАПАНУЕ З НОВАГА ГОДУ ПАЧАЦЬ ІХ АБМЕРКАВАНЬНЕ У ГРУПАХ ПАДТРЫМКІ.

УЛІЧВАЮЧЫ ВЯЛІКІ АБ'ЁМ ТЭКСТУ ПРАЕКТУ ПРАГРАМЫ І, ПЕРШ ЗА УСЁ, ТЭХНІЧНЫЯ ЦЯЖКАСЬЦІ З ДРУКАМ, АРГКАМІТЭТ БНФ ВЫРАШЫЎ ПАЧАЦЬ ПУБЛІКАЦЫЮ І АБМЕРКАВАНЬНЕ МАТЭРЫЯЛАЎ ПА РАЗЬДЗЕЛАХ. ПЕРШЫ -- "ЭКАНОМІКА".

ВЫНІКІ АБМЕРКАВАНЬНЯ У ГРУПАХ ПАДТРЫМКІ, ЗАЎВАГІ І ПАЖАДАНЬНІ, АСОБНЫЯ МЕРКАВАНЬНІ, ДУМКІ, ПРАПАНОВЫ І Г.Д. ПАВЕДАМЛЯЙЦЕ У АРГКАМІТЭТ ПІСЬМОВА АЛЬБО ВУСНА. УСЕ ЯНЫ ПА МАГЧЫМАСЬЦІ БУДУЦЬ НАДРУКАВАНЫ У "НАВІНАХ", ПРААНАЛІЗАВАНЫ І УЛІЧАНЫ КАМІСІЯЙ.

Камісія падрыхтоўкі праграмных дакументаў.

Для абмеркаваньня
у групах падтрымкі БНФ

Матэрыялы да праекту Праграмы БНФ „Адраджэньне"

ЭКАНОМІКА

1. БНФ выступае за перабудову экономікі Беларускай ССР такім чынам, каб яна служыла людзям, забясьпечвала максімальнае задавальненьне іх патрэбаў, павышэньне ўзроўню жыцьця. Асноўнымі прынцыпамі функцыянаваньня эканомікі павінны стаць: самарэгуляваньне і збалансаванасьць, гуманізм і экалагічнасьць, сацыяльная справядлівасьць і свабода эканамічных паводзінаў.

2. БНФ зыходзіць з таго, што у эканамічным разьвіцьці Савецкай Беларусі нароўні з пэўнымі посьпехамі маецца шэраг сур'ёзных дыспрапорцый і праблем. Удушлівы дыктат саюзных міністэрстваў і ведамстваў прывёў да неабгрунтаванага шматразовага апераджэньня росту прамысловасьці у параўнаньні з сельскай гаспадаркай і развіцьцём сацыяльнай сферы. На мяжы вычарпаньня знаходзяцца традыцыйныя крыніцы рэсурсаў, рэзка абвастрылася экалагічная сітуацыя. Узровень зношанасьці вытворчых фондаў і тэхналагічная адсталасьць вытворчасьці дасягнулі пагрозьлівых памераў. Хранічна не забясьпечваецца збалансаванасьць платаздольнага попыту насельніцтва з рэалізацыяй тавараў і паслугаў, што суправаджаецца ростам інфляцыі і кошту жыцьця. Абвастрылася забесьпячэньне прадуктамі харчаваньня. Зьнізілася працоўная актыўнасьць. Перабудова гаспадарчага механізму праводзіцца палавініста, непасьлядоўна і не дае адчувальных вынікаў, у тым ліку і з-за сабатажу бюракратычнага апарату.

На думку БНФ, асноўным шляхам вырашэньня набалелых праблемаў і росту спажываньня насельніцтва павінны стаць радыкальная эканамічная рэформа, гаспадарчая самастойнасьць і поўная адказнасьць рэспублікі за сацыяльна-эканамічнае разьвіцьцё сваёй тэрыторыі.

3. БНФ лічыць, што інтарэсам нашай рэспублікі і народу больш за ўсё адпавядае эканамічная самастойнасьць Беларускай ССР, заснаваная на ўнутрысаюзным падзеле працы і на суверэнным праве БССР валодаць і распараджацца усімі відамі тэрытарыяльных рэсурсаў, а таксама сваёй уласнасьцю, у якую ўваходзяць усе прадпрыемствы рэспублікі, сістэмы транспарту, сувязі, энергетыкі, інфраструктура і г. д.

У кампетэнцыю саюзнай рэспублікі ўваходзяць усе пытаньні, зьвязаныя з рэалізацыяй унутрырэспубліканскага гаспадарчага разьліку — цэнаўтварэньне, падатковая палітыка, рэгуляваньне аплаты працы і сацыяльнага забесьпячэньня, грашовае абарачэньне і крэдытная сістэма.

Аб"екты агульнасаюзнага характару /прадпрыемствы цяжкай і абароннай прамысловасьці і г.д./, што працуюць н прывознай сыравіне і забясьпечваюць агульнасаюзныя патрэбы, адносяцца да агульнай уласнасьці Саюза ССР. Іх дзейнасьць рэгулюецца даўгатэрміновымі дагаворамі з мясцовымі Саветамі і заканадаўствам.

Гандлёва-фінансавыя адносіны БССР з органамі СССР, саюзнымі рэспублікамі і замежнымі краінамі грунтуюцца на таварна-грашовых адносінах і гаспадарча-разьліковай /камерцыйнай/ мэтазгоднасьці, на прынцыпах добраахвотнасьці і раўнапраўя. БНФ патрабуе штогадова публікаваць поўны баланс усіх міжрэспубліканскіх і зьнешнегандлёвых паставак БССР у натуральным і грашовым выражэньні.

4. БНФ падтрымлівае любыя формы ўласнасьці, у тым ліку на сродкі вытворчасьці, кааператыўную, індывідуальную, калі яны садзейнічаюць росту ўзроўню жыцьця народа.

Іх рацыянальнае спалучэньне зьяўляецца падставай гаспадарчага выкарыстаньня вытворчых сіл, ператварае чалавека ў сапраўднага гаспадара. Дзяржава ахоўвае ўсе формы сацыялістычнай уласнасьці і стварае ўмовы для яе прымнажэньня, стымулюе ініцыятыву і рызыку.

БНФ падтрымлівае перадачу дзяржаўных прадпрыемстваў у часовае карыстаньне на дагаворнай аснове або ў арэнду працоўным калектывам, грамадскім арганізацыям і асобным грамадзянам.

5. Гаспадарчыя адзінкі /прадпрыемствы і аб"яднаньні/ павінны дзейнічаць у адпаведнасьці з заканадаўствам і заключанымі дагаворамі. Пры гэтым яны могуць самі, сыходзячы з рынчнай кан"юнктуры і эканамічнай мэтазгоднасьці, вызначаць наменклатуру прадукцыі і паслугаў, цэны, тарыфы і аклады, планаваць сваю дзейнасьць на падставе дагавораў са спажыўцамі і стану рынку. За вытворцамі /працоўнымі калектывамі/ павінна быць замацавана права распараджацца прадуктамі працы па сваім меркаваньні.

6. Эканамічныя сувязі паміж прадпрыемствамі, фірмамі і арганізацыямі рэалізуюцца на аснове дагавораў і эквівалентнага тавараабмену шляхам сацыялістычнага планава-рыначнага механізму. Яны абапіраюцца выключна на таварна-грашовыя адносіны і гаспадарчаразьліковую выгаднасьць. Задача ўраду рэспублікі — стварыць у БССР такі рынак, на якім прапанова тавараў і паслугаў перавышае попыт. Урад БССР забясьпечвае зьяўленьне на рынку розных вытворцаў і нармальную канкурэнцыю паміж імі, змагаецца з манапалізацыяй вытворчасьці і спажываньня, не дапускае банкруцтва прадпрыемстваў, неабходных для грамадства. Дзяржзаказы за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту прадпрыемствы павінны атрымоўваць конкурсным шляхам /паколькі яны павінны быць больш выгодныя ім у параўнаньні з іншымі кантрактамі/.

Пераход рэспублікі на гаспадарчы разьлік прадугледжвае існаваньне шматканальнага аптовага гандлю сродкамі вытворчасьці, рынку тавараў народнага спажываньня і паслугаў, а таксама ўпарадкаваньне сістэмы грашовага абарачэньня.

/Працяг на стар. 2/

 © PDF: Kamunikat.org 2014

/Працяг са стар. 1/ МАТЭРЫЯЛЫ ДА ПРАЕКТУ ПРАГРАМЫ БНФ "АДРАДЖЭНЬНЕ". ЭКАНОМІКА

Таварна-грашовыя адносіны, разнастайнасьць формаў уласнасьці і эканамічная дэмакратыя адродзяць, як паказвае сусьветны вопыт, працаўніка-гаспадара і задаволяць спажыўца. Рынак ураўнаважыць попыт і прапанову, урэгулюе бягучыя прапорцыі, вызначыць патрэбы ў таварах і забясьпечыць эквівалентны тавараабмен.

7. Кіраўнічыя органы рэспублікі павінны адмовіцца ад загадна-бюракратычных метадаў кіраваньня, дырэктыўнага планаваньня і дробязнай апекі дзейнасьці прадпрыемстваў.

Для вырашэньня агульных навукова-тэхнічных інфармацыйных, камерцыйных і юрыдычных пытаньняў на базе зацікаўленасьці гаспадарчых адзінак і за іх кошт ствараюцца міністэрствы прамысловасьці, сельскай гаспадаркі і будаўніцтва. Гэтыя міністэрствы:

— зьдзяйсьняюць сьпецыялізаванае навукова-тэхнічнае, інфармацыйнае, камерцыйнае і юрыдычнае абслугоўваньне;

— дасьледуюць попыт і прапанову, дынаміку рынчачных цэнаў;

— садзейнічаюць паскарэньню распрацоўкі і ўкараненьня перадавых дасягненьняў навукі і тэхнікі, фінансуюць фундаментальныя навуковыя дасьледваньні па асноўных накірунках разьвіцьця эканомікі.

Дзяржплан БССР перабудоўваецца ў навукова-эканамічны цэнтр эканамічнага і сацыяльнага разьвіцьця. Гэты цэнтр:

— вызначае рубяжы планавых паказчыкаў разьвіцьця рэспублікі, на якія, улічваючы канкрэтныя выгады, павінны арыентавацца прадпрыемствы;

— распрацоўвае варыянты структурнай і навукова-тэхнічнай палітыкі;

— вызначае прыярытэты ў выглядзе капітальных укладаньняў, ільготнага падаткаабкладаньня і субсідый на галіны, разьвіцьцё і рост якіх па ацэнцы ўраду БССР зьяўляецца ключавым /галіны, якія вызначаюць навукова-тэхнічны прагрэс, сельская гаспадарка, турызм, арганізацыі, арыентаваныя на зьнешні рынак/, але прыбытак ад якіх можа зьнізіцца ў выніку рыначнай кан"юнктуры;

— аналізуе эканамічнае, сацыяльнае і навукова-тэхнічнае жыцьцё ў рэспубліцы, СССР, краінах сьвету;

— рыхтуе прагнозы навукова-тэхнічнага, дэмаграфічнага і сацыяльнага разьвіцьця.

Агульныя функцыі кіраваньня ў БССР зьдзяйсьняюць міністэрствы: фінансаў, гандлю, унутраных спраў, юстыцыі, замежных спраў, народнай адукацыі, культуры, аховы здароўя, працы і сацыяльнага забесьпячэньня, аховы прыроды і гістарычнай спадчыны, транспарту і сувязі, энергетыкі, турызму і спорту. Асноўнымі рычагамі рэгуляваньня эканомікі Беларусі зьяўляюцца лімітныя цэны, падаткі і субсідыі, якія выроўніваюць умовы вытворчасьці і спажываньня, падтрымліваюць эканамічную раўнавагу.

Кіраўнічыя органы рэспублікі павінны, акрамя гэтага:

— імкнуцца да стабілізацыі рынку і рэгуляваць рыначныя адносіны з мэтай іх большай адпаведнасьці інтарэсам рэспублікі;

— садзейнічаць зьніжэньню цэнаў /змагаючыся з іх узьвінчваньнем/;

— вырашаць пытаньні разьмяшчэньня новых прамысловых і сацыяльных аб"ектаў на тэрыторыі рэспублікі з улікам навукова-экалагічнай экспертызы працоўных і прыродных рэсурсаў і патрэбнасьцяў насельніцтва;

— садзейнічаць пераадоленьню нераўнамернага эканамічнага і сацыяльнага разьвіцьця абласьцей і раёнаў Беларусі;

— распрацоўваць альтэрнатыўныя варыянты доўгатэрміновага сацыяльна-эканамічнага разьвіцьця БССР і прадстаўляць іх на ўсенароднае абмеркаваньне.

8. Галіновая і тэрытарыяльная структура эканомікі БССР павінна адпавядаць рэальным магчымасьцям і патрэбам рэспублікі, а таксама ўлічваць гістарычныя, сацыяльна-дэмаграфічныя і экалагічныя асаблівасьці Беларусі.

Неабходна перапрафіляваць прамысловасьць рэспублікі такім чынам, каб яна арыентавалася на:

— навукаёмістую вытворчасьць;

— мясцовы навукова-тэхнічны патэнцыял;

— эфектыўнае выкарыстаньне сыравінных і мясцовых працоўных рэсурсаў;

Дзяржбюджэт БССР, усе праекты будаўніцтва і рэканструкцыі прамысловых і будаўнічых аб"ектаў павінны ўсебакова абмяркоўвацца грамадскасьцю пры дапамозе сродкаў масавай інфармацыі з тым, каб яны адпавядалі сучасным патрабаваньням.

9. БНФ падтрымлівае дэцэнтралізацыю і дэканцэнтрацыю эканомікі, у тым ліку раўнамернае тэрытарыяльнае расьсейваньне і стварэньне невялікіх прадпрыемстваў на базе буйных /пры ўмове кааперацыі і магчымасьці дзяржаўнай падтрымкі/.

Замест экстэнсіўнага нарошчваньня вытворчых магутнасьцяў у перанасычаных прамысловасьцю раёнах неабходна стымуляваць эканамічнае разьвіцьцё ўскраінаў і адсталых рэгіёнаў. Трэба ліквідаваць стратныя прадпрыемствы або пераўтвараць іх у акцыянерныя ці кааператыўныя.

Аб"яднаньні /трэсты, асацыяцыі і г. д./ могуць ствараціа толькі па ініцыятыве эканамічна самастойных прадпрыемстваў і арганізацый і ўтрымоўвацца за іх кошт на долевых пачатках.

Неабходна прадставіць права працоўным калектывам пераходзіць на кааператыўныя ўмовы дзейнасьці. Пасьля гэтага яны пазбаўляюцца падпарадкаваньня міністэрствам і ведамствам, становяцца самастойнымі, атрымліваюць рэальную магчымасьць пераходу на поўны гаспадарчы разьлік і іх дзейнасьць рэгламентуецца законам аб кааперацыі.

10. Рэспубліканскія і мясцовыя органы ўлады БССР павінны ў асноўным вырашаць пытаньні разьвіцьця сацыяльнай інфраструктуры і аховы прыроды і культуры. Для гэтага ў рэспубліканскія і мясцовыя бюджэты павінна паступаць большая частка прыбытку прадпрыемстваў, а таксама плата за выкарыстаньне працоўных і прыродных рэсурсаў.

Пераразьмеркаваньне прыбыткаў забясьпечваецца с стэмай прагрэсіўнага падаткаабкладаньня, якая ў той жа час не павінна падрываць стымулы да працоўнай дзейнасьці і ўстанаўляць максімум /мяжу/ заработку /што прывядзе на справе да ўхіленьня ад платы падаткаў і да адліву рабочай сілы з грамадска важных сьфераў эканомікі/.

11. Адлічэньні ў саюзны бюджэт для выкананьня агульнасаюзных функцый /забесьпячэньне абароназдольнасьці Саюза, адзіная зьнешняя палітыка, міжрэспубліканскія навукова-тэхнічныя праграмы/ вызначае Вярхоўны Савет БССР у працэнтах ад нацыянальнага прыбытку рэспублікі. Беларуская ССР на долевых пачатках можа прымаць удзел у фінансаваньні агульнасаюзных і рэгіянальных праграмаў.

Каб пазбавіць бюракратычнай эканамічнай базы панаваньня, неабходна ліквідаваць саюзныя гаспадарчыя міністэрствы і ведамствы, замяніўшы іх гаспадарча-разьліковымі кансультатыўна-каардынацыйнымі камітэтамі, якія будуць выконваць функцыі:

— каардынацыі агульнасаюзных і рэгіянальных праграмаў эканамічнага разьвіцьця;

— камерцыйнага прагназаваньня, вывучэньня попыту, прапановы і г.д.;

— праводзеньня скаардынаванай навукова-тэхнічнай палітыкі, перападрыхтоўкі кадраў;

— каардынацыі зьнешнегандлёвай палітыкі;

— саюзнай інсьпекцыі.

12. Прадпрыемствы, арганізацыі і гаспадаркі рэспублікі маюць права ўстанаўляць і падтрымліваць прамыя эканамічныя сувязі з партнёрамі з іншых рэспублік СССР і замежных краін,

/Працяг на стар. 3/

© PDF: Kamunikat.org 2014 © PDF: Kamunikat.org 2014

/Працяг са стар. 2/ МАТЭРЫЯЛЫ ДА ПРАЕКТУ ПРАГРАМЫ БНФ "АДРАДЖЭНЬНЕ". ЭКАНОМІКА

ствараць сумесныя прадпрыемствы, весьці міжнародную камерцыйную дзейнасьць. На зьмешаныя прадпрыемствы, што дзейнічаюць на тэрыторыі БССР, распаусюджваюцца рэспубліканскія законы і міжнародныя пагадненьні.

13. У рэспубліцы павінны быць створаны спрыяльныя умовы для інвеставаньня /укладаньня/ замежнага капіталу для мадэрнізацыі вытворчасьці, запазычаньня перадавога вопыту кіраваньня вытворчасьцю і вядзеньня разнастайнай эканамічнай і навукова-тэхнічнай дзейнасьці.

14. У Беларусі неабходна адкрыць рынак вольнага продажу і набыцьця замежнай валюты /валютны аукцыён/, які стварае прадпрыемствам, што ня маюць эканамічных сувязяу з замежнымі партнёрамі, крыніцу фінансаваньня для набыцьця неабходных сродкау вытворчасьці, паслугау і ліцэнзій. На зьнешнегандлёвае абарачэньне трэба увесьці рэспубліканскі падатак, які стане адной з крыніцау паступленьня валюты.

15. Зямля зьяуляецца уласнасьцю народа і знаходзіцца у распараджэньні мясцовых Саветау, якія павінны ахоуваць земляробау ад любых спробау дыктату і эканамічнага умяшаньня.

Існуючыя сельскагаспадарчыя прадпрыемствы па рашэньні іх працоуных калектывау могуць быць пераутвораны у кааператывы або фермерскія гаспадаркі. Ім зямля прадстауляецца у бястэрміновую арэнду /бяз права продажу/ з правам спадкаваньня /насьледваньня/. Вярхоуны Савет БССР вызначае максімальны памер арэндаванай зямлі, а таксама верхнія межы зямельнага падатку і рэнты.

Арэнда можа быць спынена:
-- па жаданьні фермера /у кожны момант/;
-- у выпадку выкарыстаньня зямлі не па прызначэньні на працягу некалькіх гадоу /па рашэньні сесіі райсавета/;
-- пры неабходнасьці адводу арэндаванай зямлі пад грамадскае будауніцтва або здабычу карысных выкапняу. /Пры гэтым выканкам райсавета абавязаны са згоды селяніна выдзеліць яму зямлю у іншым месцы з выплатай належнай кампенсацыі па бягучых рыначных цэнах: выкупіць пабудовы і збудаваньні, аплаціць шматгадовыя расьліны, выплаціць пад'ёмныя, аплаціць пераезд і г.д./

Усе тыпы сельгаспрадпрыемствау плоцяць у мясцовы бюджэт адзіны зямельны падатак, а таксама рэнту у залежнасьці ад урадлівасьці глебы. Цэны на сельгаспрадукцыю вызначаюцца вытворцамі з улікам рыначнага попыту і прапановы.

16. БНФ дамагаецца прыярытэту спажыуца над вытворцам. Для абароны інтарэсау спажыуцоу прапаноуваецца:
-- стварыць Беларускае таварыства спажыуцоу;
-- рэгулярна інфармаваць насельніцтва БССР аб узроуні якасьці таварау народнага спажываньня;
-- устанавіць крымінальную адказнасьць за вытворчасьць і рэалізацыю прадуктау харчаваньня, якія утрымліваюць небясьпечныя для здароуя рэчывы, а таксама за вытворчасьць і рэалізацыю дэфектных непрадуктовых таварау.

Дзяржава павінна эканамічна /заахвочваючы канкурэнцыю/ стымуляваць насычэньне рынку таварамі і не дапускаць неапрауданага вывазу дэфіцытных таварау за межы рэспублікі.

17. За кошт пераразьмеркаваньня прыбыткау неабходна тэрмінова павысіць узровень жыцьця працоуных, асабліва тых, хто у выніку інфляцыі і перакосау у аплаце працы апынууся за "мяжой беднасьці". Павінен быць устаноулены гарантаваны пражытковы мінімум, рэгулярна карэктаваны з улікам тэмпау інфляцыі.

БНФ выступае супраць любой сацыяльнай няроунасьці, даступнымі яму сродкамі змагаецца супраць выраджэньня працоуных адносін, прыніжэньня і эксплуатацыі чалавека.

18. Першапачатковымі задачамі у сьферы эканомікі БНФ лічыць /па важнасьці і тэрмінах вырашэньня/:
-- вырашэньне харчовай праблемы;
-- пашырэньне вытворчасьці таварау і паслуг масавага попыту і першай неабходнасьці;
-- вырашэньне жыльлёвага пытаньня у цэлым;
-- ліквідацыю дэфіцыту і чэргау, г.зн. поунае насычэньне попыту.

Матэрыялы падрыхтавала эксьпертная група на чале з сябрам Аргкамітэту БНФ "Адраджэньне", доктарам эканамічных навук Аляксандрам Жураулёвым.

ПАРАДЫ ПА ПРАВЯДЗЕНЬНІ ВЫБАРЧАЕ КАМПАНІІ ГРУПАМІ ПАДТРЫМКІ БНФ «АДРАДЖЭНЬНЕ»

Паважаныя сябры!

Ідзе вылучэньне кандыдатау у народныя дэпутаты СССР. Нашая задача -- зрабіць усё магчымае, каб у вышэйшы орган улады былі абраныя с а п р а у д н ы я прадстаунікі народа, актыуныя змагары за перабудову.

У Мінску створаны чатыры тэрытарыяльныя і чатыры нацыянальна-тэрытарыяльныя выбарчыя акругі /гл. "Вячэрні Мінск" 17.12.1988/. Аргкамітэт БНФ "Адраджэньне" прапануе:

-- па тэрытарыяльнай выбарчай акрузе /ТВА/ №564 /Маскоускі і Фрунзенскі раёны г. Мінска/ вылучаць кандыдатам Віктара МАНАЕВА;

-- па ТВА №565 /Заводскі і Партызанскі раёны г. Мінска/ -- Анатоля ВЯРЦІНСКАГА;

-- па ТВА №566 /Першамайскі і Савецкі раёны г. Мінска/ -- Віктара ІВАШКЕВІЧА;

-- па нацыянальна-тэрытарыяльнай выбарчай акрузе /НТВА/ №65 /Заводскі і Партызанскі раёны г. Мінска/ -- Васіля БЫКАВА;

-- па НТВА №66 /Першамайскі і Савецкі раёны г. Мінска/ -- Юрыя ХАДЫКУ;

-- па НТВА №67 /Маскоускі і Фрунзенскі раёны г. Мінска/ -- Валерыя МАСЬЛЮКА;

-- па НТВА №68 /Ленінскі, Кастрычніцкі і Цэнтральны раёны г. Мінска/ -- Алеся АДАМОВІЧА.

УВАГА! Па ТВА №563 /Ленінскі, Кастрычніцкі і Цэнтральны раёны г. Мінска/ кандыдатура пакуль ня вылучаная.

* * *

Нашыя прапановы -- не загад для выкананьня. Па-першае, яны датычацца толькі Мінска, а, па-другое, трэба улічваць сітуацыю на месцах і вылучаць у кандыдаты людзей, якіх вы ведаеце і якім давяраеце.

Просьба да усіх групау падтрымкі у самы кароткі тэрмін актыуна далучыцца да правядзеньня выбарау па месцы працы, жыхарства, на суседніх прадпрыемствах і установах.

Аргкамітэт.

● СЬПІС КАНДЫДАТАУ БНФ

Адамовіч Алесь Міхайлавіч /н.1927, в.Канюхі Капыльскага р-на/. Удзельнік партызанскага руху на Беларусі у Вялікую Айчынную вайну. Скончыу Беларускі Дзяржауны Універсітэт. Працавау навуковым супрацоунікам, загадчыкам сектара літаратурных узаемасувязей інстытута літаратуры АН БССР. Беларускі пісьменьнік. Член-карэспандэнт АН БССР. Доктар філалагічных навук. Прафесар. Працуе у інстытуце кінематаграфіі СССР.

Быкау Васіль Уладзіміравіч /н.1924, в.Бычкі Ушацкага р-на/. Вучыуся у Віцебскім мастацкім вучылішчы. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

/Працяг на стар. 4/

/Працяг са стар. 3/

Працаваў у газеце "Гродненская правда", сакратаром аддзялення гродзенскай арганізацыі СП БССР. Народны пісьменьнік БССР. Лаўрэат Ленінскай і Дзяржаўнай прэміі СССР. Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР. Член Аргкамітэту БНФ "Адраджэньне".

Вярцінскі Анатоль Ільіч /н.1931, в.Дзямешкава Лепельскага р-на/. Скончыў Беларускі Дзяржаўны Універсітэт. Працаваў у рэдакцыях раённых газет, выдавецтве "Беларусь", літаратурным кансультантам СП БССР, сакратаром праўленьня СП БССР. Беларускі паэт. Член КПСС. Галоўны рэдактар газеты "Літаратура і мастацтва".

Івашкевіч Віктар Антонавіч /н.1959, г.Мінск/. Скончыў Мінскае ПТВ № 107. Служыў у войску. Вучыўся ў Беларускім Дзяржаўным Універсітэце на завочным факультэце. Працуе грузчыкам-стропальшчыкам на Мінскім міжгаліновым прадпрыемстве прамысловага чыгуначнага транспарту. Член савета працоўнага калектыву ўчастка ММПЧТ. Член рады аб"яднаньня "Талака".

Манаеў Віктар Сяргеевіч /н.1958, г.Мінск/. Скончыў Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут. Актор Беларускага Дзяржаўнага тэатра ім.Янкі Купалы. Член КПСС. Член ЦК ЛКСМБ. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР.

Масьлюк Валеры Васільлевіч /н.1953, в.Ропна Полацкага р-на/. Скончыў Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут. Працаваў рэжысерам Магілеўскага абласнога драматычнага тэатра. Галоўны рэжысер Рускага дзяржаўнага драматычнага тэатра БССР. Член КПСС. Дэлегат XIX Усесаюзнай партканферэнцыі. Член Аргкамітэту БНФ "Адраджэньне".

Хадыка Юры Віктаравіч /н.1938, г.Мінск/. Скончыў Беларускі Дзяржаўны Універсітэт. З 1960 г. працуе ў Інстытуце фізікі АН БССР. Загадчык лабараторыі. Доктар фізіка-матэматычных навук. Прафесар. Член КПСС.

● ПАД ЧАС ВЫЛУЧЭНЬНЯ КАНДЫДАТАЎ НЕАБХОДНА

1. Кожнаму члену групы азнаёміцца з законам аб выбарах /гл."Известия" за 4.12.88 г./;

2. Кожнаму члену групы прыкласьці максімум намаганьняў, каб вылучыць кандыдатаў БНФ у сваім працоўным калектыве. Дзеля гэтага трэба:

а/ правесьці прапагандысцкую працу сярод членаў свайго працоўнага калектыву за кандыдатаў БНФ і іх праграму;

б/ зьвярнуцца ў свой савет працоўнага калектыву ці прафкам з патрабаваньнем склікаць сход працоўнага калектыву дзеля вылучэньня кандыдата ў дэпутаты зьезда народных дэпутатаў СССР;

в/ прыняць удзел у сходзе і аргументавана агітаваць за вылучэньне кандыдатаў БНФ: аднаго -- у тэрытарыяльную акругу, другога -- у нацыянальна - тэрытарыяльную. Кандыдаты лічацца вылучанымі, калі за іх прагаласавала большасьць /50 % плюс адзін голас/ сходу, на якім прысутнічала больш паловы сьпісачнай колькасьці членаў працоўнага калектыву;

г/ скласьці пратакол сходу, дзе пазначыць: месца, дату, час правядзеньня сходу, назву працоўнага калектыву, колькасьць удзельнікаў сходу, назвы выбарчых акруг, па якіх вылучаюцца кандыдаты, прозьвішчы, імёны, імёны па бацьку кандыдатаў, іх месца працы і жыхарства, колькасьць галасоў "за", "супраць" і "устрымалася", подпіс старшыні ці намесьніка савета працоўнага калектыву ці прафкама;

д/ аб пасьпяховых выніках сходу па вылучэньні кандыдатаў БНФ тэрмінова паведаміць у Аргкамітэт БНФ і прадставіць копію пратаколу;

э/ зарэгістраваць вылучаных кандыдатаў у акруговай выбарчай камісіі, прадставіўшы пратакол сходу і пісьмовую згоду кандыдата балатавацца у дадзенай выбарчай акрузе /браць праз Аргкамітэт БНФ/;

ж/ у выпадку склікаьня акруговага выбарчага сходу прыкласьці максімум намаганьняў, каб на сход былі дэлегаваныя тыя людзі, што будуць цьвёрда і аргументавана адстойваць кандыдатаў БНФ.

3. Кожнаму члену групы трэба парупіцца, каб вылучыць кандыдатаў БНФ па сваім месцы жыхарства. Дзеля гэтага неабходна:

а/ скласьці заяву ў выканкам мясцовага Савету народных дэпутатаў з просьбаю дапамагчы ў правядзеньні сходу выбаршчыкаў дзеля вылучэньня кандыдатаў ў дэпутаты. Сабраць пад гэтай заявай не менш 500 подпісаў выбаршчыкаў свайго раёну, якія папярэдне знадзіліся галасаваць за кандыдатаў БНФ;

б/ занесьці гэтую заяву ў выканкам мясцовага Савету народных дэпутатаў і дамагчыся прадстаўленьня памяшканьня для сходу;

в/ прыняць удзел у сходзе і аргументавана агітаваць за кандыдатаў БНФ. Колькасьць выбаршчыкаў на сходзе павінна быць не менш 500 чалавек. Кандыдаты лічацца вылучанымі, калі за іх прагаласавала большасьць /50 % плюс адзін голас/ прысутных на сходзе ;

г/ скласьці пратакол сходу, дзе пазначыць тое ж, што і ў пратаколе сходу працоўнага калектыву, падаўшы назву раёна, жыхарамі якога зьяўляюцца ўдзельнікі сходу.

Пункты Д, Е, Ж такія ж, як і адпаведныя пункты ў разьдзеле аб вылучэньні кандыдатаў ад працоўных калектываў.

Пад час перадвыбарчай кампаніі пасьля зацьвярджэньня кандыдатаў БНФ акруговымі выбарчымі камісіямі, членам груп неабходна прыняць актыўны ўдзел у перадвыбарчай агітацыі за кандыдатаў БНФ у форме:

а/ агітацыі на словах;

б/ распаўсюджваньня перадвыбарчых бюлетэняў БНФ, праграмы кандыдатаў БНФ;

в/ вырабу і распаўсюджваньня лістовак і аб"яваў з заклікамі галасаваць за кандыдатаў БНФ;

г/ пікетаў з плакатамі таго ж зьместу;

д/ і г.д. у любой іншай, зручнай для групы форме.

Для правядзеньня выбарчай кампаніі, друкаваньня дакументаў і бюлетэняў БНФ неабходныя грашовыя сродкі. Просім аказаць апэратыўную фінансавую падтрымку.

РАЗЬЛІКОВЫ РАХУНАК 164804 ПЕРШАМАЙСКАГА АДДЗЯЛЕНЬНЯ ЖЫЛСАЦБАНКУ. КОД БАНКУ 40021. НУМАР АШЧАДНАЙ КАСЫ 8006/0112. РАХУНАК 37352. САДОЎСКАМУ ПЯТРУ ВІКЕНЦЬЕВІЧУ.



Мал. А.Вранцава, афармленьне А.Косткі.

Па даручэньні Аргкамітэту нумар падрыхтавалі: А.Суша, А.Радкевіч.

